**АПІВЕ́НЬ**, персанаж народных павер'яў; нячысцік, які чапляецца да людзей, схіляючы іх да п'янства. Прысутнічае на ўсіх застоллях, сочачы, хто колькі выпівае. Падбухторвае не надта пітушчых выпіць паболей. Калі гэта яму не ўдаецца, падсыпае ім у чарку нейкага зелля, пасля чаго чалавек робіцца зусім п'яны. Любіць забаўляцца з п'яніцамі, дражнячы іх і скідваючы пад стол. Пабачыць А. можна толькі на добрым падпітку. Яго знешнасць спалучае ў сабе антрапа- і зааморфныя рысы. Ён уяўляецца невялічкай істотаю, парослай цёмнай рэдкай поўсцю. Галава па форме нагадвае чалавечую, толькі са свіным рылам, а там, дзе павінны быць бровы, — тырчаць маленькія, як у маладога бычка, рожкі. Ёсць у А. хвосцік, закручаны, нібы ў парсючка, ножкі з капыткамі. Ходзіць прама альбо ракам. Сцвярджаюць, што няма на свеце п'яніцы, які здолеў бы перапіць А. Сам жа нячысцік, колькі б ні піў, надта п'яным не будзе. Пра чалавека, які шмат п'е, але не п'янее, гавораць, што ён п'е, як А. Гэты персанаж згадваецца ў Мядзельскім раёне.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 458.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ